МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
«ПОЛОЦКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ»

# ТРУДЫ

## МОЛОДЫХ СПЕЦИАЛИСТОВ ПОЛОЦКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА

Основан в 2004 г.

Выпуск 57

## ГУМАНИТАРНЫЕ НАУКИ

### История

Новополоцк
2012

3. Мартос, А. Беларусь в исторической, государственной и церковной жизни / А. Мартос. – Минск: Белорусский Экзархат, 2000. – 352 с.
4. Мельхисидек. Русское Православие [Электронный ресурс] / ред. Андреев Г., Web-мастер. Щерба К. – Электрон. дан. – М.: SK Communication International, 2008. – Режим доступа: http://www.orthorus.ru/cgi-bin/ps_file.cgi?2_2278.
5. Навіцкі, У. Палітыка расколу Рускай Праваслаўнай Царквы ў Беларусі (1920-я гг.) / У. Навіцкі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2003. – № 2. – С. 40 – 48.
6. Нацыянальны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь у г. Мінску (НГАБ). – Фонд 2786. – Воп. 1. – Спр. 1.
7. Цыпин, В. История Русской Православной Церкви 1917 – 1990 / В. Цыпин. – М.: «Хроника», 1994. – 252 с.
8. Шиленок, Д. Из истории Православной Церкви в Белоруссии (1922 – 1939) / Д. Шеленок. – М.: Крутицкое подворье, 2006. – 218 с.

**УДК 27(091)(476.5)”1930/1936”=161.3**

## ЗАНЯПАД АБНАЎЛЕНЧАГА РУХУ НА ТЭРЫТОРЫІ ПОЛАЦКА-ВІЦЕБСКАЙ ЕПАРХІІ Ў 1930-Я ГГ.

***В.В. БАРАНЕНКА***
***(Прадстаўлена: канд. гіст. навук, дац. Д.У. ДУК)***

*Разглядаюцца некаторыя аспекты заняпаду абнаўленчага руху на тэрыторыі Полацка-Віцебскай епархіі ў 1930-я гг. Раскрываюцца тагачасныя грамадска-палітычныя ўмовы існавання праваслаўных храмаў ў вызначаны перыяд.*

У 1931 г. улады пайшлі на чатсковыя ўступкі ў тых раёнах дзе не было ніводнай дзеючай царквы. Быў атрыманы дазвол на рэгістрацыю некаторых прыходаў. Скарыстаўшымся гэтым Віцебскае абнаўленчае епархіальнае ўпраўленне арганізавала 20 акруговых прыходаў, размеркаваных на 5 благачынняў [6, с. 1]. Аднак у выніку цяжкага матэрыяльнага становішча епіскап Ніл (Ушакоў) 3 студзеня 1932 г. пакідае Віцебск. Замест Ніла (Ушакова) на Віцебскую кафедру Беларускі Сінод назначае з Разані архіепіскапа Міхаіла (Постнікава). Нарадзіўся ён 30 верасня 1878 гады. У 1900 годзе скончыў Варонежскую духоўную семінарыю, затым праслухаў два курса Томскага ўніверсітэта на медыцынскім факультэце і перайшоў у Яраслаўскі (Дземідаўскі) ліцэй, які скончыў у 1904 годзе з прысваеннем ступені кандыдата права. У 1911 годзе скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага ўніверсітэта з прысваеннем навуковай ступені магістра гістарычных навук. Поўную адукацыю скончыў за мяжой. Да 1920 года служыў у сістэме Міністэрстваў, а затым Наркамата Народнай Асветы. З 1920 года святар Казанскай царквы с. Усмані Варонежскай епархіі. У 1922 годзе ўхіліўся ў абнаўленскі раскол і прызначаны ўпаўнаважаным ВЦУ па Варонежскай епархіі ў сане протаіерэя. У кастрычніку 1922 гада быў хіратанісан у епіскапа Вольскага, вікарыя Саратаўскай епархіі. Са снежня 1924 года – часова кіраўнік Пскоўскай епархіі. 14 мая 1927 года быў узведзены ў сан архіепіскапа ў гонар 5-гадовага юбілея абнаўленства [5].

Прыбыўшы ў Віцебск 2 верасня 1932 года архіепіскап быў незадаволены становішчам епархіі. На той час па епархіі налічвалася толькі 16 святароў. У справаздачы новага архіерэя ў Сінод аб становішчы духавентсва ў епархіі казалася: “Сумнае і вельмі бядотнае становішча назіраецца ў Віцебскай абнаўленскай епархіі. Не кажучы ўжо пра святароў. Сярод іх знаходзяцца людзі няўстойлівых поглядаў і перакананняў, а то і відавочныя дэгенераты. Большасць з’яўляюцца простымі трэбавыканаўцамі, нават не аддаючы сабе справаздачы і яснага ўяўлення пра сваё прызначэнне. Узаемная нянавісць, зайздрасць, незадаволенасць існуючым становішчам, інтрыгі, аж да відавочнай здрады, адсутнасць паняццяў пра царкоўную дысцыпліну, ганарлівасць, алкагалізм, грэбаванне правіламі маралі – вось тыя адметныя якасці, якімі павінны быць ахарактарызаваны шматлікія. Падобныя элементы толькі цярпімы памяркоўнымі веруючымі, якія страцілі павагу і распалажэнне да іх. Такое становішча ў абнаўленстве недапушчальна і з’явілася яно з прычыны адсутнасці патрэбнага кіраўніцтва цэнтральнымі царкоўнымі органамі. Усё гэта неабходна ўлічыць і як мага хутчэй прыняць меры да аднаўлення звычайнага становішча” [7, с. 36].

Стыль кіравання Міхаіла (Постнікава) быў жорсткім: ён дамагаўся адкрыцця абнаўленчых прыходаў любымі сродкамі, у прыватнасці, даваў распараджэнні пачынаць набажэнствы, не чакаючы рэгістрацыі ў органах улады, што магло прывесці да арышту святара [1, с. 163].У хуткім часе быў арыштаваны і Міхаіл па абвінавачванні ў “актыўнай контррэвалюцыйнай агітацыі” і ва ўдзеле “ў контррэвалюцыйнай царкоўна-паўстанскай арганізацыі”. Аднак епіскап вінаватым сябе не прызнаў. 9 чэрвеня 1933 г. ён быў прысуджаны да зняволення тэрмінам на 5 гадоў, 1 лістапада прысуд быў зменены на высяленне ў Паўночны край на 3 гады.

У маі 1932 года ў Маскве праходзілі ўрачыстыя мерапрыемствы ў сувязі з 10-годдзем узнікнення абнаўленчага руху. На святкаванне быў запрошаны і старшыня Беларускага Сінода мітрапаліт Данііл. Там ён паспрабаваў звярнуць увагу Свяшчэннага Сінода на цяжкае становішча беларускіх абнаўленцаў. Аднак не знайшоўшы падтрымкі па вяртанню адазваўся аб членах Сінода, як "людзі прыватнага інтарэсу і асабістага дабрабыта" [4, с. 105].

23 чэрвеня 1933 г. Віцебскім гарсаветам было выдадзена абавязковая пастанова аб забароне калакольнага звону. Веруючыя і духавенства ў большасці аднеслася да гэтага абыякава, не супярэчачы, што пацверджваецца наступнымі фактамі. Так, царкоўны актыў Васкрасенскай царквы г. Віцебска наконт гэтай пастановы выказаўся наступным чынам: "У нашай царкве званіць і не трэба, мы і да гэтага не званілі; царква размяшчаецца на такім месцы, у цэнтры горада, тут жа змяшчаюцца банк, вучэбная ўстанова, шмат прахожых, так што званіць нават і не зручна, калі хто захоча маліцца, той і так прыдзе ў царкву і будзе ведаць, калі служба пачынаецца" [2, с. 94].

У сваю чаргу царкоўны актыў Пакроўскай царквы, даведаўшыся аб забароне калакольнага звону, у прыватнасці стараста царквы Бельскі ў размове са святаром выказаўся: "Страшнага ў гэтым нічога няма, калакольны звон нічога істотнага не дае. Усё роўна, колькі бы мы не званілі, роўна да пачатку службы ніхто не з'явіцца, прыходзяць са спазненнем у царкву і не ўсе веруючыя царкоўны звон чуюць. Той, хто захоча наведваць царкву і будзе адданы Богу, той прыйдзе памаліцца і без звону" [2, с. 95]. Аднак, нягледзячы на выказванні прадстаўнікоў цэркваў, калакольны звон па дзеючым цэрквам Віцебска падчас малебнаў поўнасцю спынены не быў. Хоць у большасці цэрквах звон праводзіўся ў адзін колакал, а ў некаторых цэрквах звон праводзіўся ў рэдкіх выпадках – толькі па царкоўным святам.

На 1 ліпеня 1933 года ў Віцебску налічвалася 9 цэркваў, якія мелі калакалы. З якіх 3 не фунцыянавалі, да ціханаўцаў належыла 3, да абнаўленцаў – 3 [2, с. 93].

У ліпені 1933 года ў Віцебск прыезджае архіепіскап Аршанскі Сергій Дабрамыслаў. Нарадзіўся ў 1862 году. Скончыў Маскоўскую духоўную акадэмію са ступенню кандыдата багаслоўя. Пасля быў інспектар Таўрычнай духоўнай семінарыі ў сане святара. Удовым у 1922 г. ухіліўся ў абнаўленчы раскол. 14 лютага 1923 г. хіратанісан у епіскапа Севастопальскага. Быў удзельнікам Сабора 1923 года. 22 лістапада 1923 г. – епіскап Запарожскі, вікарый Екацярынаслаўскай епархіі.У 1926 г. ўзведзены ў сан архіепіскапа. У 1928 г. – архіепіскап Магілёўскі. У тым жа 1928 г. – архіепіскап Аршанскі. З 1933 г. быў архіепіскапам Віцебскім [9, с. 176]. Пад яго кіраўніцтвам 17 ліпеня і адбыўся епархіальны з'езд.

На епархіальным з'ездзе было зноў адноўлена епархіяльнае ўпраўленне, а таксама было прынята рашэнне аб скасаванні Полацкай і Аршанскай епархіі, далучыўшы іх да Віцебска. На Віцебскую кафедру быў абраны Сергій Дабрамыслаў. У выніку аб'яднання прыходы епархіі ў новых межах былі падзелены на тры благачынні з 21 царквой:

а) Віцебскае благачынне – у складзе 4 цэркваў. Віцебскі Спаскі сабор, віцебская Петрапаўлаўская царква, лепельскі сабор і царква ў Сіроцінскім раёне [9, с. 164];

б) Полацкае благачынне – 10 цэркваў. У самім Полацку функцыянавала два абнаўленчых храма – Свята-Духаўскі сабор і царква Святога апостала і евангеліста Іаана Багаслова;

в) Дрысенска-Асвейскае благачынне – 7 цэркваў [9, с. 181].

У 1933 годзе архіепіскапу Сергію было ўжо 71 год. Аднак у жніўні ён вырашыў здзейсніць урачыстую службу ў гонар прарока Іллі ў Бешанковічах. У час вандроўкі архіерэй захварэў і яго паралізавала. Становішча хворага палепшалася толькі ў пачатку 1934 г.

20 снежня 1934 г. выйшла пастанова Свяшчэннага сінода праваслаўных цэркваў у СССР, паводле якога Беларускі сінод ставіўся ў падпарадкаванае становішча да яго. Аўтаномія Беларускай праваслаўнай абнаўленчай царквы была такім чынам ліквідавана.

26 студзеня 1935 г. Свяшчэнны сінод праваслаўных цэркваў у СССР, на сваім пасяджэнні заслухаўшы даклад мітрапаліта Данііла (Грамавенко), пастанавіў вызваліць яго ад абавязкаў старшыні Беларускага святога Сінода і выключыць са спісаў епіскапата абнаўленчай праваслаўнай царквы. Трэба меркаваць, што ён спрабаваў абараніць аўтаномію Беларускай праваслаўнай абнаўленскай царквы і жорстка паплаціўся за гэта. Выкананне абавязкаў старшыні Сінода было ўскладзена на архіепіскапа Полацка-Віцебскай епархіі Сергія (Дабрамыслава), а 30 студзеня 1935 г. старшынёй Сінода быў прызначаны былы епіскап Новасібірскай епархіі Пётр (Бліноў).

У маі 1935 г. Магілёўскае епархіяльнае ўпраўленне атрымала Пастанову Свяшчэннага сінода ад 29 красавіка 1935 г. "Пра скасаванне калегіяльнай сістэмы кіравання ў Праваслаўнай абнаўленчай царкве", якім усе абнаўленчыя сіноды і епархіяльныя ўпраўленні скасоўваліся на ўсёй тэрыторыі СССР.

У жніўні 1935 г. архіепіскап Сергій Дабрамыслаў быў назначаны на Мазырскую кафедру, аднак ад назначэння ён адказаўся. У выніку гэтага 5 жніўня 1935 г. за непадпарадкаванне яго зволілі ў штат. Архіепіскап застаўся жыць у Віцебску. 18 верасня 1937 г. 75-гадовы абнаўленчы архіерэй быў арыштаваны па абвінавачванні ў "падрыхтоўцы контррэвалюцыйных паўстанцкіх кадраў для звяржэння савецкай улады на выпадак ваенных дзеянняў з фашысцкімі дзяржавамі". 28 верасня 1937 г. прысуджаны да

растрэлу [1, с. 163]. Таксама трэба заўважыць, што ў жніўні – верасні 1937 г. былі арыштаваны больш за 20 святароў Віцебскай епархіі, "старацаркоўнікаў" і абнаўленцаў, іх расстралялі 7 кастрычніка таго ж года ў Віцебску.

1937 год стаў апошнім у жыцці віцебскіх дзеючых храмаў. 11 кастрычніка на пасяджэнні Віцебскага гаркама была прынята пастанова аб закрыцці застаўшыхся цэркваў Віцебска, з прычыны таго, што яны нібыта з'яўляліся рассаднікам контррэвалюцыйнай працы ў горадзе [3, с. 309]. Малітоўнае і літургічнае жыццё ў Віцебску працягвалася праз таемнае здзяйсненне набажэнстваў і абрадаў. У канцы 1930-х гадоў у Віцебску заставалася некалькі святароў, іх прыналежнасць да расколу не заўсёды ясная, паколькі для пераходу з абнаўленства ў патрыяршую Царкву патрабаваўся толькі акт пакаяння, які нідзе ў той час не фіксаваўся.

Прычынай гэтага, як зазначае І. Салаў'ёў, было тое, што галоўны змест абнаўленчага расколу складаўся зусім не ў набажэнскіх рэформах, а ў згодніцтве з савецкай уладай, у пошуках новай "сімфоніі" з дзяржавай, у прыстасаванні да яе. Абнаўленцы ішлі па шляху адзяржаўлення Царквы, але бязбожная дзяржава хутка перастала мець патрэбу ў іх паслугах і цалкам скасавала сама гэту плынь [8].

Другой немалаважнай прычынай было і тое, што з самага пачатку вырашыла далейшы лёс абнаўленчага руху, – яго не падтрымала асноўная частка веруючых. Менавіта яны адмоўна аднесліся да ўсіх рэформаў абнаўленцаў, што выклікала цяжкае матэрыяльнае становішча абнаўленчых святароў і знікненне абнаўленчага руху ў цэлым.

ЛІТАРАТУРА

1. Горидовец, В. К истории обновленческого раскола в Витебске / В. Горидовец // Вестник церковной истории. – 2007. – № 3(7). – С. 157 – 166.
2. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (далей – ДАВВ). – Фонд 102-п. – Воп. 1. – Спр. 188.
3. ДАВВ. – Фонд 102-п. – Воп. 1. – Спр. 563.
4. Левчик, Н. Обновленческая церковь в Беларуси (по документам фонда «Белорусский православный синод», 1922 – 1935 гг.) / Н. Левчик // Архівы і справаводства. – 2002. – № 4. – С. 97 – 106.
5. Михаил (Постников). Русское Православие [Электронный ресурс] / ред. Андреев Г., Web-мастер. Щерба К. – Электрон. дан. – М.: SK Communication International, 2008. – Режим доступа: http://www.ortho-rus.ru/cgi-bin/ps_file.cgi?2_420.
6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Мінску (далей – НГАБ). – Фонд 2786. – Воп. 1. – Спр. 467.
7. НГАБ. – Фонд 2786. – Воп. 1. – Спр. 547.
8. Соловьев, И. «Обновленческий» раскол и литургические реформы / И. Соловьёв // Церковный Вестник [Электронные ресурсы] / Электрон. дан. – М.: Епархия, 2006. – Режим доступа: http://www.tserkov.info/numbers/history/?ID=2636.
9. Шиленок, Д. Из истории Православной Церкви в Белоруссии (1922 – 1939) / Д. Шеленок. – М.: Крутицкое подворье, 2006. – 218 с.

**УДК 27(091)(476.5)"1920"=161.3**

## УНУТРЫЦАРКОЎНАЕ ЖЫЦЦЁ ГОРАДА ПОЛАЦКА НА ПАЧАТКУ 1920-Х ГАДОЎ

***В.В. БАРАНЕНКА***
***(Прадстаўлена: канд. гіст. навук, дац. Д.У. ДУК)***

*Зроблены разгляд прычынаў узнікнення і развіцця абнаўленчага руху, а таксама ўзаемаадносіны дадзенага руху з ціханаўцамі ў г. Полацку напачатку 1920-х гадоў. Паказана, што ў дадзены прамежак часу на Полаччыне мела месца падтрымка савецкай уладай абнаўленцаў.*

Знаходзячыся ў поўнай залежнасці ад дзяржавы, Руская Праваслаўная Царква на працягу даволі працяглага часу не мела магчымасці вырашаць свае ўнутраныя праблемы, большасць з якіх было звязана з парушэннем прынцыпаў саборнага кіравання і самаўпраўнасцю епіскапату. Першыя рэальныя спробы змяніць царкоўнае жыццё рабіліся ўжо ў другой палове XIX стагоддзя, калі дух пераўтварэнняў аказваў моцны ўплыў на ўсе сферы грамадскага жыцця і грамадскай свядомасці. Аднак прадстаўнікі прагрэсіўных царкоўных кругоў змаглі выявіць сябе толькі ў гады першай рускай рэвалюцыі.

На пачатку XX стагоддзя ва ўрадавым асяроддзі адзначылася тэндэнцыя да разгляду магчымасці правядзення пераўтварэнняў інстытута праваслаўнай царквы. Па рэкамендацыі Мікалая II усім архірэям быў разасланы апытальнік аб становішчы і неабходнасці пераўтварэнняў праваслаўнай царквы [11, с. 37].

Большасць епіскапаў, у тым ліку і полацкі епіскап Серафім (Мешчарыкоў), выступала за аднаўленне патрыяршаства, рэгулярнасць сабораў, ліквідацыю обер-пракурорства, аўтаномію царквы і яе аддзяленне